ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

**Асвятленне парламенцкіх выбараў 2008 г. у беларускіх СМІ**

Бюлетэнь № 6

*(5 – 20 верасня 2008 г.)*

Мінск, 23 верасня 2008 г. ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” – незалежная, незаангажаваная беларуская грамадская арганізацыя, адданая прынцыпам свабоды слова і СМІ, праводзіць сістэмны маніторынг асвятлення парламенцкіх выбараў у Беларусі, якія маюць адбыцца 28 верасня. Яго мэта – вызначыць, наколькі поўна ды ўсебакова беларускія медыя асвятляюць дзейнасць кандыдатаў і іх выбарчыя праграмы, з тым каб беларускія грамадзяне пры галасаванні маглі зрабіць кампетэнтны і ўсвядомлены выбар. Высновы маніторынгу робяцца на падставе строгай метадалогіі і маюць на мэце не падтрымаць таго ці іншага кандыдата або палітычную партыю, а спрыяць аб’ектыўнаму і сумленнаму асвятленню выбарчай кампаніі ва ўсёй медыйнай прасторы.

За дадзены перыяд аб’ектамі маніторынгу БАЖ былі 4 агульнанацыянальныя і рэгіянальныя тэлеканалы, тры радыёстанцыі, 9 газет і 4 інтэрнэт-выданні.[1] Пры аналізе праграм навін высновы рабіліся на падставе часу, які адводзіўся прэтэндэнтам, а таксама Прэзідэнту, ураду і іншым задзейнічаным у выбарах структурам (суб’ектам маніторынгу). Ацэньваўся таксама тон асвятлення іх дзейнасці. Сумарны час, які адводзіўся суб’ектам маніторынгу ў праграмах навін, вызначаўся метадам колькаснага аналізу. Для ацэнкі тону рэпрэзентацыі (станоўчага, нейтральнага ці адмоўнага) выкарыстоўваўся метад якаснага аналізу. У графіках-дадатках пададзеныя вынікі маніторынгу за перыяд з 5-га да 20-га верасня.

Цягам гэтага перыяду зарэгістраваныя кандыдаты працягвалі весці перадвыбарчую агітацыю, у тым ліку выступалі ў дзяржаўных СМІ, а *ЦВК* сумесна з Беларускай нацыянальнай тэлерадыёкампаніяй прыняла рашэнне паўторна рэтрансляваць выступы кандыдатаў у запісе.

## Асноўныя вынікі

Хоць рашэннем *ЦВК* аб рэтрансляцыі выступаў кандыдатаў фармальна ўдвая павялічыўся час, адведзены кандыдатам у дзяржаўных электронных СМІ, гэта не паспрыяла таму, каб выбарцы маглі сфармаваць сваё меркаванне пра кандыдатаў. Як і раней, некаторыя выступы трансляваліся ў гадзіну “пік” (з 17.30 да 18.30 на тэлеканале *“ЛАД”),* калі большасць насельніцтва не магла іх убачыць. А “паўторы” на канале *СТВ* ( з 18.00 да 20.00, за выключэннем суботы і нядзелі) не былі адпаведным чынам анансаваны ў мэдыях. На жаль, названае рашэнне *ЦВК* не тычылася перадруку праграм кандыдатаў у дзяржаўнай прэсе.

[1] Аналіз БАЖ ахоплівае 20 сродкаў масавай інфармацыі, а менавіта: тэлевізійныя і радыёпраграмы *“Наши новости» (ОНТ), “Панорама недели”* (*Першы Нацыянальны канал БТ*), *“Навіны рэгіёна”* (Гомель), “*Новости-Регион” / ТРК “Магілёў”,“Радыёфакт” (Першы нацыянальны канал беларускага радыё), “Навіны”, Гомельскае абласное радыё (101.3 FM*), “*Навіны”, абласное радыё ТРК “Магілёў”,* газеты *“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”, “Рэспубліка”, “Белорусы и рынок”, “Народная воля”,* “«*Комсомольская правда*» *в Белоруссии”;* “*Брестский кур’ер*”, “*Гомельская праўда”, “Могилёвская правда”, “Днепровская Неделя”,* інтэрнэт-выданні www.belta.by, www.naviny.by, www.tut.by і інтэрнэт-версія “Еўрапейскага радыё для Беларусі” www.euroradio.fm.

Паўтор выступаў кандыдатаў не змяніў агульную карціну асвятлення выбарчай кампаніі. Як і раней, у падачы інфармацыі пра выбарчы працэс дзяржаўныя СМІ засяроджваліся на тэхнічных ды арганізацыйных аспектах і абміналі ўвагай саму передвыбарчую кампанію і яе асноўных дзейных асобаў – палітычныя партыі і кандыдатаў. Прыкладамі такога падыходу могуць служыць агульнанацыянальны канал *ОНТ* (*праграма навінаў “Наши новости”), 1-ы канал Беларускага радыё* (*праграма “Радыёфакт”)* і прэзідэнцкая газета *“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня*” (гл. адпаведныя графікі).

Больш за тое, названыя медыя па-ранейшаму адводзілі *Прэзідэнту* і *ЦВК* столькі часу і плошчы, нібыта яны і ёсць галоўныя суб’екты выбарчай кампаніі. Адрозна ад іншых суб’ектаў, з агульнай колькасці часу і плошчы ім адводзілася ад 87% (*праграма “Радыёфакт” 1-га каналу Беларускага радыё*) да 99% (*газета “Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”*).

А тыя СМІ, якім не было прадпісана трансляваць выступы кандыдатаў і друкаваць іх праграмы, так і не павялічылі долю часу і плошчы, адведзеных выбарчай тэматыцы. Напрыклад, у праграме *“Радыёфакт” 1-га каналу Беларускага радыё* за папярэдні перыяд маніторынгу (23 жніўня – 5 верасня 2008 г.) асвятленню выбарчага працэсу прысвячалася 10% ад яе агульнага часу, а за гэты перыяд – менш як 9%.

Нарэшце, як і раней, дзяржаўныя СМІ практычна ігнаруюць той факт, што сутнасць парламенцкіх выбараў – у выбары паміж рознымі палітычнымі праграмамі і платформамі, паміж рознымі сацыяльна-палітычнымі сцэнарыямі развіцця беларускага грамадства, а не у тэхнічных працэдурах і падрыхтоўцы да дня галасавання. У дзяржаўных СМІ таксама дасюль не з’явілася аглядаў і ўзважаных каментароў, прысвечаных розным палітычным партыям і іх пазіцыі.

Як гэта ні парадаксальна, але такое асвятленне выбарчай кампаніі, пры якім ігнаруецца сапраўдая канкурэнцыя паміж яе суб’ектамі, лічыцца за норму і нават за дасягнене. Газета *“Рэспубліка”* (18 верасня 2008 г.), напрыклад, пісала: **“***Предвыборная ситуация в Беларуси не оставляет сомнения в том, что выборы в стране пройдут в спокойной деловой атмосфере***”.**

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што некаторыя дзяржаўныя электронныя СМІ, не абавязаныя трансляваць выступы кандыдатаў, павялічылі долю часу, прысвечанага выбарам. Гэтак, аналітычная праграма *“Панорама недели” 1-га нацыянальнага канала Беларускага тэлебачання* адвяла 71% часу асвятленню выбарчай кампаніі. Больш за тое, сярод асноўных суб’ектаў фігуравалі *апазіцыя, апазіцыйныя кандыдаты* і *палітычныя партыі.* Аднак усе яны прэзентаваліся ў выключна адмоўным святле.

Параўнаўча з папярэднім перыядам, незалежныя газеты і інтэрнэт-выданні падавалі больш інфармацыі пра палітычныя партыі і кандыдатаў. Напрыклад, на незалежным інтэрнэт-рэсурсе www.naviny.by амаль удвая павялічыўся аб’ём віртуальнай прасторы, прысвечанай апазіцыйным кандыдатам, і значна вырасла прастора, адведзеная розным палітычным партыям. Манера рэпрэзентацыі апазіцыйных кандадатаў была пераважна нейтральнай. Збалансавана гэты сайт асвятляў дзейнасць прэзідэнта і кандыдатаў ад улады. А недзяржаўная газета *“Народная Воля”* нават надрукавала адмысловы выпуск, прысвечаны *Аб’яднанай грамадзянскай партыі* і яе кандыдатам. Аднак трэба яшчэ раз падкрэсліць, што надзвычайная абмежаванасць накладу не дазваляе недзяржаўным газетам кампенсаваць хібы ў працы дзяржаўных СМІ па данясенні інфармацыі пра

кандыдатаў і іх праграмы. Тое ж тычыцца і інтэрнет-выданняў, аўдыторыі якіх істотна меншыя за аўдыторыі дзяржаўных электронных СМІ.

**Высновы**

Дадзеныя гэтага перыяду маніторынгу пацвярджаюць раней вызначаныя тэндэнцыі: дзяржаўныя медыя асвятляюць перадвыбарчую кампанію такім чынам, каб звесці да мінімуму палітычную канкурэнцыю паміж рознымі палітычнымі сіламі, маргіналізаваць альтэрнатыўныя палітычныя праграмы і іх рэпрэзентантаў.

Рашэнне ЦВК паўтарыць у запісе выступы кандыдатаў не змяніла агульнага характару асвятлення выбарчай кампаніі. У дзяржаўных медыя па-ранейшаму адсутнічае поўная карціна палітычнай сітуацыі ў краіне, а выбарчай кампанія – у тым выглядзе, у якім яна асвятляецца - пазбаўлена хоць якой драматургіі, духу суперніцтва ды канкурэнтнай барацьбы. Апроч таго, асвятленне ўдзельнікаў выбарчага працэсу ў дзяржаўных СМІ далёка не заўсёды нейтральнае і не заўсёды бесстароннае.

Дзяржаўныя медыя пакуль ня здолелі падаць выбарцам дастатковую інфармацыю пра кандыдатаў і іх палітычныя платформы, каб тыя ў дзень галасавання маглі зрабіць кампетэнтны і ўсвядомлены выбар. Да таго ж, названыя СМІ не рэпрэзентуюць кандыдатаў у дэпутаты  як галоўных суб'ектаў выбарчай кампаніі.

Малаверагодна, каб за час, які застаўся да дня галасавання, сітуацыя магла змяніцца.

## ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

**БЕЛТА**

06.09-20.09.2008

### Адзінка вымярэння - колькасць знакаў






## Брестский курьер

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Белорусы и рынок

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Першы нацыянальны канал, Панорама недели

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Першы нацыянальны канал, Панорама недели

06.09-19.09.2008



**ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008**

## Агульнанацыянальнае тэлебачанне (ОНТ)

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## Агульнанацыянальнае тэлебачанне (ОНТ)

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)



# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Гомельскае абласное радыё 101.3 FM

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Гомельскае абласное радыё 101.3 FM

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)



## "Навіны рэгіёна" (Гомель), Першы нацыянальны канал

06.09-20.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






**“Навіны рэгіёна” (Гомель), Першы нацыянальны канал**

06.09-20.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**



ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Гомельская праўда

06.09-20.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)



## “Беларусь сегодня”

06.09-19.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

**Рэспубліка**
06.09-19.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

**NAVINY.BY**
06.09-19.09.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**




